Вынікі конкурсу малюнкаў “Мая катэхеза”

Аўтар: Рэдакцыя
09.10.2016 00:00



У нумары газеты “Слова Жыцця” за 28 жніўня быў аб’яўлены конкурс, дзе маленькім чытачам прапанавалася адлюстраваць на паперы свой занятак па катэхезе.

Прыемна здзівіла, што ўдзельнікі адказна аднесліся да сваіх прац. Дасланыя малюнкі ўяўляюць сабой карціны, у якія трэба ўглядацца ў пошуках сэнсу.

Сёння рэдакцыя падводзіць вынікі і хоча адзначыць наступныя тры малюнкі.

Вікторыя Юрчык (9 гадоў), Ліда

У цэнтры ўвагі на малюнку Вікторыі – катэхетка, якая распавядае пра Езуса міласэрнага. Аб гэтым гавораць промні, якія выходзяць з Яго сэрца. Відаць, што дзеці ведаюць пра Хрыста і Яго поўнае ласкі сэрца, таму што як адзін цягнуць рукі ўгору. На ўсіх іх сплывае Божая міласэрнасць, якая сагравае разам з промнямі сонца. Па баках малюнка – хлопчык і дзяўчынка, якія з цікаўнасцю пазіраюць на астатніх. Раскрытая кніга азначае даступнасць гэтай праўды для ўсіх. †



Ангеліна Целеш (11 гадоў), Рось

На малюнку Ангеліны – катэхеза, якую праводзіць святар. Тэма занятка – “Бог ёсць Любоў”. Крыніца ведаў знаходзіцца ў Біблii – узорным дапаможніку, без якога ў жыцці не абыдзецца ні адзін чалавек. Па правым баку святара размешчаны абраз з выявай Марыі і Езуса – спасылка на тое, што кожным у небе апекуюцца. На стале ў класе стаіць запаленая свечка, якая сімвалізуе прысутнасць Бога, і крыж – выразнае праяўленне любові Усемагутнага, які аддаў за грахі чалавецтва свайго Сына.

Вынікі конкурсу малюнкаў “Мая катэхеза”

Аўтар: Рэдакцыя
09.10.2016 00:00

